**Бібліятэцы ў падарунак**

Калекцыя з 5 тысяч экземпляраў (298 найменняў) кніг расійскіх выдавецтваў перададзена ў дар Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Гэта гістарычная, мастацкая, вучэбна-метадычная літаратура, энцыклапедыі па мастацтве і культуры, якія прадстаўляюць лепшыя ўзоры высакаякаснай паліграфіі.

Падобныя набыткі як крыніца папаўнення фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі складаюць каля 22 працэнтаў ад усіх яе паступленняў. Большасць з іх перададзена Пасольствам Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь ад імя ўрада Расійскай Федэрацыі і ўрада горада Масквы, а таксама рознымі расійскімі выдавецтвамі і кнігагандлёвымі арганізацыямі. Напрыклад, 548 найменняў расійскіх выданняў былі падораны сёлета Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў ходзе 13-й Мінскай Міжнароднай выстаўкі-кірмашу "Кнігі Беларусі-2006".

**Ірына СВІРКО, «Р»**